Формирование культурно-исторической идентичности в незападных обществах может опираться на ряд положений. Прежде всего, это признание социально значимых культурных ценностей, таких, как патриотизм, чувство собственного достоинства, гражданственность, уважение к исторической памяти своего и других народов, ведущими в формировании мировоззрения учащихся, осмысление их места и роли в историческом процессе, историко-культурной преемственности в различные эпохи. Также важным моментом является восприятие исторического процесса во всем его многообразии, отказ от лженаучных дихотомий «тоталитаризм – демократия», «цивилизация – варварство» и др., которые деформируют сознание учащихся, задавая однобокое восприятие действительности (в котором отечественная историческая традиция часто выступает в невыгодном свете). Представляется необходимым и знакомство учащихся с генеалогией для развития интереса к истории собственной семьи, историческим корням, видения взаимосвязи человека и эпохи. Данный подход формирует у учащихся уважение к семейным ценностям, осознание взаимосвязи эпох и поколений, ответственное отношение к созданию семьи, интерес и почтение к истории своего рода и исторической традиции. Учащимся может в качестве вариативного задания по выбору даваться описание в той или иной форме истории своего рода, места и роли своих прародителей в значимых общественно-политических событиях (например, Великая Отечественная война, индустриальные стройки XX века, которые затронули практически все семьи), и т.д.

Литература

1. Трубецкой Н.С. Русская проблема/ Н.С. Трубецкой // URL: http://nevmenandr.net/eurasia/1922-naputiax-NST-rusprob.php

## *Мушынскі М.І.* Праблема справядлівасці ў публіцыстыцы Якуба Коласа і Янкі Купалы і сучасныя прыярытэты яднання народаў

Выдатныя беларускія песняры Янка Купала і Якуб Колас ў сваіх публіцыстычных творах неаднаразова закраналі праблему справядлівасці. Вядома, іх погляды нельга разглядаць ў якасці

навукова абгрунтаванай тэарэтычнай канцэпцыі. Але паэтычны склад душы дазволіў гэтым дзеячам культуры Беларусі інтуітыўна звярнуцца да найбольш значных праблемаў грамадскага жыцця, злучыць справядлівасць з антыноміямі адносін чалавека да навакольнага прыроднага асяроддзя і да іншага чалавека. Таму іх разважанні наконт справядлівага чалавечага існавання захавалі сваю каштоўнасць, значна ў чым маглі б знайсці далучэнне на карысць філасофскага абгрунтавання сучасных прыярытэтаў яднання народаў.

Трэба адзначыць, што выдатны паэт і, ўвогуле, іскравы прадстаўнік беларускай культуры Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцевіч, 1882 - 1942) заўжды хваляваўся пра шчаслівы лёс усяго простага народу незалежна ад яго этна-культурнай прыналежнасці, імкліва абураўся ў сваіх творах на тыя ці іншыя праявы сацыяльнага прыгнёту, актыўна змагаўся з несправядлівасцю ў яе разнастайных формах. Аб гэтым сведчыць Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, 1882 - 1956) ў некралогу ―Памяці друга”, што быў надрукаваны неўзабаве пасля трагічнай смерці Купалы (ён загінуў падчас маскоўскай камандыроўкі, трапіўшы ў лесвічны пралёт гасцініцы, абставіны чаго не маюць канкрэтных сведкаў да гэтай пары): ―От имени народа и голосом народа страстно протестует Купала против социальной несправедливости” [1, с. 662]. Звяртаючыся ў сваёй паэзіі да краявідаў роднай прыроды, Купала лічыў, што і асабісты чалавек як прыродная істота роўны з іншым чалавекам, таму ён не павінны яго несправядліва прыгнечваць, ствараць для самого сябе выключнае становішча на той ці іншай падставе.

Гэта магчыма аднесці і да калектыўнага маральнага суб’екта, да міжнародных зносін, дзе прамыслова развітыя краіны заўжды стваралі каланіяльную сістэму, імкнуліся знішчыць адна адну ў сусветных войнах і міжнацыянальных канфліктах (на мяжы трэцяга тысячагоддзя да гэтага далучыліся практыка міжнароднага тэрарызму, праблемы глабалізацыі, падзеі на Украіне і інш.). У гэтых абставінах ―Купала становится глашатаем идей интернационализма, идей дружбы народов, … торжества идей правды и справедливости” [1, с. 663]. Кожны народ, па меркаванню Купалы, у духоўным сэнсе роўны з іншым народам, усе яны нясуць каштоўныя рэчы ў скарбніцу сусветнай культуры, таму па справядлівасці за-

слугоўваюць да сябе паважных адносінаў. У якасці прыклада можна прывесці ―Речь на юбилейном VII пленуме СП СССР, посвящѐнном 1000-летию армянского героического эпоса «Давид Сасунский»”, дзе Купала непасрэдна сцвярджае: ―По справедливости, эта поэма может быть поставлена в один ряд с ―Илиадой” и ―Нибелунгами”, ―Словом о полку Игореве” и ―Витязем в тигровой шкуре”…” [2, с. 279]. Яшчэ ў старажытныя часы кожны народ набыў сваеасабістыя культурныя рысы, якія па справядлівасці трэба не вынішчаць (каб для сябе набыць ―жыццѐвую прастору”, як, у прыватнасці, заклікала нацысцкая прапаганда), а наадварот – уважліва вывучаць і выкарыстоўваць усѐ каштоўнае дзеля далейшага развіцця ўсяго сусветнага грамадства: ―Купала твѐрдо верит в торжество разума и справедливости” [1, с. 664].

Гэтыя купалаўскія меркаванні непасрэдна датычацца і беларускай нацыянальнай спадчыны. Паэт звяртаў увагу на несправядлівае становішча, што склалася на працягу беларускай гісторыі, калі простым людзям - носьбітам нацыянальнай культуры, супрацьстаяла польскамоўная ці рускамоўная палітычная эліта грамадства. У палемічным артыкуле ―Почему плачет песня наша?” (адказ Юрке Веращаке, надрукаваны ў 1913 годзе) Купала кажа: ―Эта несправедливость рождала у поэта лишь жалость, что рядом с излишней роскошью (природы – М.М.) народ…- мужики беспомощные, покинутые своей интеллигенцией” [2, с. 251]. Трэба гадаваць, робіцца высновa, сапраўды народную творчую эліту, што магла б стаць на чале простага люду, на падставе справядлівасці павесці яго да лепшай будучыні, да рэалізацыі гістарычнага прызначэння беларускай культуры.

З сацыякультурнага боку гледжання, Купала ў сваіх публіцыстычных творах далучаецца да ―цывілізацыйнага падыходу”, які быў агульнапрынятым у пачатку XX стагоддзя, і зноў звяртаецца ў гуманітарныя веды ў нашыя часы (як антытэза ―фармацыйнай” трактоўцы грамадзкага жыцця). Адпаведна яму, чалавецтва праходзіць ў сваім развіцці стадыі дзікасці (першабытнага ладу), варварства (напрыклад, готы і вандалы ў часы Рымскай імперыі) і цывілізацыі (апошняя звязана з узнікненнем дзяржаўных установаў: арміі, судовай сістэмы, кіруючай улады і гэтак далей). Сусветныя цывілізацыі, ў сваю чаргу, падзяляюцца на Усход (старажытныя дэспатыі Егіпта, Месапатаміі, Індыі, Кітая, пазней – Расійская імпе-

рыя) і Захад (дэмакратычныя сістэмы антычнага перыяду – Грэцыя, рэспубліканскі Рым; сучасныя еўрапейскія дэмакратыі). У сэнсе міжцывілізацыйнага дыялогу і сінтэзу, якія адпавядаюць найбольш сучасным трактоўкам справядлівасці ў эпоху глабалізацыі, Беларусь застаецца відавочным прыкладам, набывае новую гістарычную ролю. Так ў лісце ад 23.07.1925 г. Купала падкрэсліў: ―Белоруссия… немало пережила. Не раз… была она ареной кровавых битв между Западом и Востоком. Но Белоруссия играла ещѐ и иную, связующую роль: через еѐ народ и просторы распространялись некогда великие и общечеловеческие идеалы в области науки и знаний... Если же вглядимся в современные события, то доля Белоруссии та же, только на иной манер: через еѐ народ и просторы снова идут, только уже с Востока на Запад, великие и общечеловеческие идеи. Нужно твѐрдо верить, что верх возьмѐт правда" [2, с. 254]. Палітычныя лідэры Баларусі і Казахстана, што ў нашыя часы набылі незалежнасць, павінны на падставе крытэрыяў справядлівасці спрыяць далейшай рэалізацыі сучасных прыярытэтаў яднання народаў.

Беларускі пясняр Якуб Колас таксама імкнуўся ўсебакова абгрунтаваць прынцыпы справядлівасці, далучыць да гэтай працы шырокія колы прадстаўнікоў народнай інтэлігенцыі. Выступаючы на юбілейным вечары 02.11.1946 г., ѐн казаў: ―Люди моего поколения, вышедшие из народа и добившиеся хоть небольшого образования, не могли не видеть несправедливости. Но поднимать голос за народ, выступать за него во имя справедливости и правды было опасно" [1, с. 680]. Па яго меркаванню, ў сучасным грамадстве рэалізацыя справядлівасці залежыць ад больш трывалых адносін да працоўнага чалавека, павышэння яго сацыяльнага статуса.

Той, хто больш працуе, хто выконвае больш складаную работу, павінен мець адпаведную пашану ад іншых. Менавіта ў гэтым сэнсе, ў якасці свята ўсіх працоўных людзей, і ―Первомай – это торжество нашей… глубокой оптимистической веры в справедливость" [1, с. 693]. Катэгорыя ―веры" як інтуітыўнага спасціжэння самой сутнасці справядлівасці, займае значнае мейсца ў творчай спадчыне Коласа.

Рэлігія і навука, па меркаванню Коласа, павінны пазітыўна ўзаемадзейнічаць паміж сабою; навука дае чалавеку новыя веды, праз

тэхніку пашырае яго матэрыяльныя магчымасці,- рэлігія вядзе яго ў агульным накірунку добразычлівасці і справядлівасці: —Освобождѐнная энергия атома должна служить целям созидания. Идѐт новый мир, и никакие атомные бомбы… не остановят победного движения… к правде и справедливости” [1, с. 701 - 702]. Усе людзі таксама павінны далучацца адзін да аднаго, аб’ядноўваць свае намаганні дзеля дасягнення справядлівасці, гэтай спрадвечнай мэты ўсяго чалавецтва.

Звяртаючыся ў сваѐй паэтычнай творчасці да роднай прыроды, простай сялянскай працы, заклікаючы да сацыяльнай справядлівасці, беларускія песняры Янка Купала і Якуб Колас закранаюць глыбінныя крыніцы народнай душы. Менавіта гэтыя матывы (Чалавек, Радзіма, Праца, Зямля) складаюць выснову нацыянальнай свядомасці, дапамагаюць сучаснаму грамадзяніну, што жыве ў эпоху глабалізацыі, не страціць свае карані, ўсвядоміць этнічную самаідэнтыфікацыю на карысць усяму чалавецтву. Па меркаванню сучасных філосафаў, гэтыя каштоўнасці трэба шырэй выкарыстоўваць дзеля выхавання маладога пакалення, ў тым ліку ў межах вышэйшых навучальных установ інжынерна-тэхнічнага накірунку [3, s. 40]. Як казаў Я. Колас, —мы не должны забывать о том, что на нашу Родину… с верой и надеждой смотрят простые люди мира, жаждущие справедливого, наиболее совершенного устройства жизни” [1, с. 672]. Разважанні беларускіх народных паэтаў Якуба Коласа і Янкі Купалы наконт справядлівасці ў значнай якасці захавалі сваю каштоўнасць, у сучасных абставінах яны падкрэсліваюць прыярытэты яднання народаў  Еўразіі і ўсяго сусвету.

Літаратура

1. Колас Якуб. Собр. соч. в 4 т. - М., 1952. Т. 4.

2. Купала Янка. Собрание сочинений: в 3 т.- М., 1982. Т. 3.

3. Glosikova O. Niektore teoreticke vychodiska noveho ponimania procesu vzdelavania sućasnej mladej generacie // Zbornik prac z teoreticko-metodickeho seminara „Rozvijanie klućovych kompetencii študentov vysokych škol technickeho zamerania v podmienkach KHV”.- Preśov, 2004